Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Прарэктар па вучэбнай рабоце
_____ А.В. Данільчанка

_____

Рэгістрацыйны нумар № УД-___/баз.

Археалогія

Вучэбная праграма для спецыяльнасцей
1-21 03 01 Гісторыя (па накірунках)
1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

Тэрмін дзеяння праграмы – да мая 2018 г.

2013 г.

Складальнікі :

А.А. Егарэйчанка, загадчык кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар ;

Э.М. Загарульскі, прафесар кафедры археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін Беларускага дзяржаўнага універсітэта, доктар гістарычных навук, прафесар.

Рэцэнзенты*:*
М.А. Бяспалая, доктар гістарычных навук, прафесар кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў”;

Л.У. Калядзінскі, дацэнт кафедры дапаможных гістарычных дысцыплін і методыкі выкладання гісторыі установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт імя Максіма Танка», кандыдат гістарычных навук, дацэнт.

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай археалогіі і спецыяльных гістарычных дысцыплін гістарычнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 11 ад 16.05.2013 г.);

Вучэбна-метадычнай камісіяй гістарычнага факультэта Беларускага дзржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 7 ад 28.05.2013 г.);

Адказны за рэдакцыю: Э.М. Загарульскі і А.А. Егарэйчанка

Змест

Тлумачальная запіска..... 4

Прыкладны вучэбна-метадычны план..... 6

Змест вучэбнай дысцыпліны..... 11

Літаратура..... 20

Тлумачальная запіска

Вялікая частка гісторыі чалавецтва, якая налічвае каля 3 млн гадоў, была беспісьмовай. Разам з тым вельмі мізерная інфармацыя маецца ў пісьмовых крыніцах аб раннекласавых грамадствах. Гэта робіць археалогію адной з важнейшых дысцыплін, якая вывучае пачатковыя этапы гісторыі чалавечага грамадства. Курс “Археалогія” ставіць мэтай даць студэнтам уяўленне аб археалогіі як асноўнай частцы гістарычнай навукі, азнаёміць іх з крыніцамі і метадамі археалагічнага даследавання, археалагічнай перыядызацыяй, асноўнымі этапамі і археалагічнымі культурамі ў сусветнай гісторыі ўвогуле і беларускай гісторыі ў прыватнасцію.

Дысцыпліна “Археалогія” ставіць **мэтай:**

— даць студэнтам уяўленне аб археалогіі як састаўной частцы гістарычнай навукі,
— азнаёміць іх з крыніцамі і метадамі археалагічнага даследавання,
— азнаёміць з асновамі археалагічнай перыядызацыі і асноўнымі этапамі і археалагічнымі культурамі ў сусветнай гісторыі наогул і беларускай гісторыі ў прыватнасці.
— даць студэнтам глыбокія веды тэарэтычных асноў этнічных працэсаў у стражытнасці.
— пазнаёміць студэнтаў з асновамі арганізацыі і правядзення археалагічных раскопак.
— сфарміраваць у студэнтаў навукова-даследчыя і практычныя навыкі.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

ведаць:

— навуковыя падыходы да аналіза археалагічных матерыялаў;
— асноўныя тэорыі грамадскага развіцця ў адпаведнасці з фармацыйным і цывілізацыйным падыходамі да разглядання працэсаў гістарычнага развіцця;
— асноўныя тэорыі этнагенеза, этнічнай гісторыі славян і балтаў;
— спецыяльныя дысцыпліны ў аб’ёме, неабходным для самастойнага правядзення навуковых даследаванняў, уключаючы метадалогію археалагічных даследаванняў, методыку палявых работ, археалагічную перыядызацыю і характарыстыку асноўных перыядаў старажытнай гісторыі Беларусі і сумежных тэрыторый.

умець:

— правільна вызначыць тып археалагічнага аб’екта (помніка) на мясцовасці: стаянкі, селішча, гарадзішча, кургана, грунтована пахавання, сістэмы абарончых збудаванняў і інш.;
— вызначыць наяўнасць або адсутнасць старажытных культурных напластаванняў пры правядзенні земляных прац у ямах, траншэях, катлаванах;
— вызначыць прыналежнасць старажытнага керамічнага матэрыяла да адпаведнай археалагічнай эпохі (каменнага, бронзавага, жалезнага вякоў або сярэднявечча);
— вызначыць тып і прызначэнне канкрэтнага археалагічнага артэфакта;

— устанавіць папярэднюю дату і культурную прыналежнасць археалагічнай знаходкі;
— здзейсніць рэгістрацыю археалагічнай знаходкі (назва прадмета, матэрыял, з якога ён зроблены, папярэдняе датаванне і культурная прыналежнасць, умовы выяўлення, прывязка да мясцовасці, месца захавання);
— прыняць меры да захавання і рэгістрацыі выяўленага археалагічнага аб’екта;
— выкарыстаць археалагічныя матэрыялы ў навучальнай, прафесійнай і асветніцкай дзейнасці;
— ужываць на практыцы разнастайныя метады археалагічных даследаванняў;
— планаваць, арганізоўваць і весці навуковыя даследаванні, уключаючы збор, апрацоўку і інтэрпрэтацыю экспедыцыйных археалагічных матэрыялаў;
— тлумачыць уплыў розных фактараў на сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё насельніцтва Беларусі ў дадзяржаўны і раннедзяржаўны перыяды;
— аналізаваць асноўныя этапы этнічнай гісторыі насельніцтва на тэрыторыі Беларусі.

Прыкладны вучэбна-тэматычны план
для дзённага аддзялення
Спецыяльнасць 1-21 03 01 “Гісторыя” (па накірунках)
1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

№п/п	Наименование разделов, тем	Количество часов				
		Аудиторные				Самост. работ
		Лекции	Практич., семинар.	Лаб. занят.	КСР	
	Модуль 1. Асновы археалогіі	30			6	24
	Уводзіны. 1. Прадмет археалогіі. 2. Археалагічны пошук. 3. Археалагічныя раскопкі. 4. Археалагічная храналагізацыя. 5. Камеральная апрацоўка археалагічных матэрыялаў.	4				2
	Каменны век 1. Палеаліт. 2. Мезаліт. 3. Неаліт. Азначальныя рысы неаліту. 4. Тапаграфія стаянак. 5. Археалагічныя культуры неаліту.	6			2	6
	Энеаліт і бронзавы век 1. Перыядызацыя і храналогія бронзавага веку. 2. Культуры бронзавага веку.	6				4

	Паўночнай Беларусі					
	Жалезны век 1. Агульная характарыстыка жалезнага веку Беларусі. 2. Ранні жалезны век Паўднёвай Беларусі. 3. Жалезны век Паўночнай Беларусі. 4. Жалезны век Сярэдняй і Паўночна-Заходняй Беларусі.	4	2			10
	Славяне і іх суседзі ў другой палове I тыс. н.э. 1. Старажытнасці балтаў другой паловы I тыс. н.э. 2. Славянскія помнікі другой паловы I тыс. н.э.	2	2			8
	Археалогія сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі 1. Эпоха ранняга сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі. 2. Феадальныя замкі. 3. Археалогія позняга сярэднявечча (XIV—XVIII ст.). 4. Гарады заходніх зямель Русі.	4	2		2	10
	ВСЕГО	48	12		10	78

Прыкладны вучэбна-тэматычны план
для завочнага аддзялення
Спецыяльнасць 1-21 03 01 “Гісторыя” (па накірунках)
1-23 01 12 Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны

№п/п	Наименование разделов, тем	Количество часов				
		Аудиторные				Самост. работ
		Лекции	Практич., семинар.	Лаб. занят.	КСР	
	Модуль 1. Асновы археалогіі	26				128
1.	Уводзіны. 1. Прадмет археалогіі. 2. Археалагічны пошук. 3. Археалагічныя раскопкі. 4. Археалагічная храналагізацыя. 5. Камеральная апрацоўка археалагічных матэрыялаў.	4				24
2.	Каменны век 1. Палеаліт. 2. Мезаліт. 3. Неаліт. Азначальныя рысы неаліту. 4. Тапаграфія стаянак. 5. Археалагічныя культуры неаліту.	6				26
3.	Бронзавы век 1. Асноўная сутнасць і храналагічныя межы бронзавага веку Беларусі 2. Сярэднядняпроўская культура 3. Палеская культура	6				26

	шнуравой керамікі 4. Позні бронзавы век Паўночнай Беларусі					
4.	Жалезны век 1. Пачатак жалезнага веку. 2. Жалезны век Еўропы. 3. Славяне і іх суседзі. 4. Заходнееўрапейскае сярэднявечча.	6				26
5.	Старажытная Русь 1. Старажытнарускія гарады. 2. Старажытнаруская вёска. 3. Узнікненне Русі паводле археалагічных даных.	4				26
	ВСЕГО	26	–		–	128

Змест вучэбнай дысцыпліны

Модуль 1. Асновы археалогіі

Уводзіны

Прадмет археалогіі. Вызначэнне археалогіі і яе месца сярод гістарычных навук. Станаўленне археалогіі як навукі. Асноўныя тыпы гістарычных крыніц. Віды археалагічных помнікаў. Асноўныя заканадаўчыя палажэнні аб ахове археалагічных помнікаў.

Археалагічны пошук. Арганізацыя археалагічных разведак. Гістарычныя мэты археалагічнага пошуку. Адкрытыя лісты (дазволы). Апытанне мясцовых жыхароў. Культурны слой. Візуальныя разведкі. Знешнія прыкметы археалагічных аб'ектаў. Аэра- і касмічная разведка і яе магчымасці. Электрапошук. Магнітная разведка. Іншыя метады выяўлення і першаснага вывучэння помнікаў. Падводная археалогія. Афармленне вынікаў разведак. Зводы археалагічных помнікаў.

Археалагічныя раскопкі. Установы і арганізацыі, якія здзяйсняюць археалагічныя раскопкі. Фінансаванне палявых даследаванняў. Асноўныя палажэнні аб раскопках. Даследаванне паселішчаў. Вызначэнне аб'ёму раскопачных работ. Выбар месца і разбіўка раскопа. Тэхніка вывучэння культурнага слоя. Стратыграфічныя назіранні. Палявы дзённік. Чарцёжныя і фатаграфічныя работы. Калекцыйны вопіс. Палявая лабараторыя. Методыка раскопак пахавальных помнікаў. Справаздача па раскопках.

Камеральная апрацоўка археалагічных матэрыялаў. Рэстаўрацыя і кансервацыя. Аналіз стратыграфічных звестак. Стратыграфічнае чляненне. Трасалогія. Мікраструктурныя аналізы. Мадэляванне ў археалогіі. Магчымасці вывучэння этнасаў паводле археалагічных звестак. Паняцце "археалагічная культура". Супрацоўніцтва археалогіі з геалогіяй, лінгвістыкай, антрапалогіяй, этнаграфіяй.

Археалагічная храналагізацыя. Абсалютная і адносная храналогія. Тыпалагічны метад. Стратыграфічны метад. Радыякарбонны метад датавання. Археамагнітны метад. Дэндрахраналогія (наўгародскі вопыт). Іншыя метады датавання.

Тэорыі развіцця ў археалагічнай навуцы. Гістарычныя заканамернасці і адлюстраванне іх у археалогіі. Тэорыя дыфузіі. Тэорыя культурных колаў. Цыклізм. Канцэпцыя Тойнбі. Тэорыя канвергентнага развіцця. "Культурная антрапалогія". "Культурныя мадэлі".

Каменны век

Палеаліт. Ранні палеаліт. Археалагічная перыядызацыя. Антрапаген. Выкапнёвыя антрапоіды. Алдувайская эпоха. Храналогія. Галечныя прылады. Ашэльская эпоха. Храналогія. Архантрапы. Тэхніка левалуа. Нуклеус. Ручное рубіла і калун. Геаграфія ашэльскіх помнікаў. Ледніковыя перыяды. Роля агню ў працэсе антрапагенезу. З'яўленне тэхнікі скола.

Эпоха мусцье. Суадносіны з ледніковымі перыядамі. Храналогія. Палеаантрапы. Тэхніка апрацоўкі крэмня. Нуклеусы мусцьерскай эпохі. Паўторная апрацоўка. Тыпы мусцьерскіх прылад. Аджымны і контрударны рэтуш. Першая састаўная прылада. Касцяныя прылады. Домабудаўніцтва. Арганізацыя палявання. Першыя пахаванні. Геаграфія мусцьерскіх стаянак. Пытанне аб археалагічных культурах.

Позні палеаліт. Нэаантрапы. Новыя прыёмы апрацоўкі камня. Форма нуклеуса. Вядучыя тыпы прылад. Прылады з косці. Гаспадарка. Пачатак рыбнай лоўлі. Паселішчы. Познепалеалітычнае жыллё. Асноўныя стаянкі позняга палеаліту. Арганізацыя грамадства. Познепалеалітычныя пахаванні. Сунгір. Палеалітычнае мастацтва. Арэал позняга палеаліту і рэгіянальныя асаблівасці.

Мезаліт. Змяненні прыродна-геаграфічных умоў. Засяленне новых земляў. Прыкметы мезаліту. З'яўленне мікралітаў, стрэл. Выкарыстоўванне мікралітаў у састаўных прыладах. Індывідуалізацыя палявання. Узрастанне ролі рыбнай лоўлі. Культурныя зоны і культуры мезаліту. Стаянкі і жытло мезаліту. Мезалітычнае мастацтва. Сацыяльная арганізацыя мезалітычных калектываў. Пытанне аб з'яўленні вытвараючых гаспадарак. Джэйтунская культура. Мезаліт лясной паласы Усходняй Еўропы.

Неаліт. Азначальныя рысы неаліту. Дэмаграфічныя змяненні. Зачаткі горнай справы. Шахтны спосаб здабычы крэмня. Новыя прыёмы апрацоўкі каменя. Шліфаванне, свідраванне, пілаванне камня. Удасканаленне сякеры. Апрацоўка дрэва. Касцяныя і рагавыя прылады. З'яўленне і распаўсюджванне керамікі. Тэхніка ручной лепкі. Арнаментацыя посуду. З'яўленне ткацтва.

Тапаграфія стаянак. Жытло. Гаспадарка. Сродкі перамяшчэння. "Неалітычная рэвалюцыя".

Археалагічныя культуры неаліту. Спосабы выдзялення. Археалагічная культура і этнас у неаліце.

Неаліт Заходняй Еўропы. Лясны неаліт. Паляўніча-рыбалавецкія культуры. Стэпавы неаліт Усходняй Еўропы. Могільнікі. Аленевостраўскі могільнік. Мастацтва неаліту. Адрозненні ў тэмпах развіцця неалітычных грамадстваў.

Энеаліт і бронзавы век

Перыядызацыя і храналогія бронзавага веку. Адкрыццё металу і ўзнікненне металургіі. Этапы развіцця каляровай металургіі. Асноўныя металургічныя цэнтры. Тэхніка бронзаліцейнай справы і найстаражытныя вырабы з металу. Развіццё вытворчых гаспадарак. Абмен. Новыя сродкі перамяшчэння. Гандлёвыя шляхі. Змены ў грамадскіх адносінах. Міграцыі.

Культуры бронзавага веку. Энеаліт Закаўказзя і Паўночнага Каўказа. Энеалітычныя культуры Заходняй і Паўднёвай Еўропы. Трыпольская культура. Пытанне аб Індаеўрапейцах і іх міграцыях. Археалагічныя прыкметы індаеўрапейцаў. Роля старажытных плямён у этнічнай гісторыі Еўропы. Культура шарападобных амфар.

Бронзавы век Закаўказзя. Старажытнаямная, катакомбавая і зрубная культуры. Бронзавы век Цэнтральнай Еўропы. Тшынецкая і лужыцкая культуры. Бронзавы век лясной паласы Усходняй Еўропы. Фаццянаўская культура. Прыбалтыйская культура шнуравай керамікі. Гаспадарка плямён бронзавага веку. Этнічныя працэсы ў бронзавым веку. Мастацтва.

Археалогія Старажытнага Усходу, Егіпта, Грэцыі і Рыма

Двурэчча. Адкрыцці ва Уры. Гаспадарка шумераў па археалагічных даных. Кераміка. Ганчарны круг і яго паступовае распаўсюджванне. Гліна ў матэрыяльнай культуры шумераў. Зброя. Гліняныя пісчыя таблічкі. Пячаткі. Вырабу з металу. Плуг.

Егіпет. З'яўленне дзяржавы паводле археалагічных даных. Грабніцы. Прылады земляробства. Сельскагаспадарчыя культуры. Кераміка. Папірус. Шкло. Паяўленне і распаўсюджванне каляровай металургіі. Помнікі Даліны Цароў.

Старажытная Грэцыя. Археалогія гамераўскай эпохі. Адкрыцці Шлімана. Жалезаапрацоўка. Сельскагаспадарчыя прылады і культуры. Вінаробства. Зброя. Грашовае абарачэнне. Ганчарная справа. Асноўныя тыпы керамікі. Распісны посуд. Гліняныя статуэткі. Грэчаскія калоніі ў Прычарнамор'і. Херсанес і Ольвія.

Археалогія Старажытнага Рыма. Прагрэс у жалезаапрацоўцы. Прылады вытворчасці. Інструмент. Рымская зброя. Рымскія ваенныя лагеры.

Ювелірная справа. Пісьмо. Медыцынскі інструмент. Рымскі срэбны посуд.

Удасканаленне плуга. Вынаходства жняяркі. Жорны. Вадзяныя млыны.

Прыватныя і грамадскія будынкі. Роспіс дамоў. Барэльефы. Рымскія лазні. Пампея. Пахаванні. Надмагіллі. Рымскія калоніі ва Усходняй Еўропе. Рымскі экспарт.

Жалезны век

Пачатак жалезнага веку. Адкрыццё спосабу атрымання жалеза. Сыradутны працэс. Уплыў адкрыцця жалеза на працэс грамадскага развіцця. Распаўсюджванне гарадзішчаў.

Жалезны век Еўропы. Храналогія: гальштат, латэн, рымская эпоха. Асноўныя культуры жалезнага веку Заходняй Еўропы. Пшэворская і вельбаркская культуры.

Этнічныя групы ва Усходняй Еўропе. Культуры стэпаў. Паходжанне скіфаў. Асноўныя прыкметы скіфаў паводле археалагічных даных. Паселішчы. Гаспадарка. Пахаванні. Царскія курганы. Скіфскае золата. Выцясненне скіфаў сарматамі. Скіфы ў Крыме. Культура сарматаў. Чарняхоўская культура.

Культуры балцкіх і фіна-угорскіх плямён.

Заходнееўрапейскае сярэднявечча. Агрубенне культуры ў пасляантычны час. Меравінгская, каралінгская і капетынгская эпохі.

Прылады землеапрацоўкі. Плуг і саха. Рамёствы. Адкрыццё чыгуну і новага спосабу атрымання жалеза. Вырабы ювеліраў. Кераміка. Манетная справа.

Пісьменнасць. Стылі. Пергамент і папера. Оптыка. Гадзіннік. Эвалюцыя раннесярэднявечнай зброі. Мячы. З'яўленне агнястрэльнай зброі. Развіццё абароннай зброі. Гербы дзяржаўныя і фамільныя.

Змены ў пахавальнай абраднасці.

Славяне і іх суседзі. Пытанне аб часе з'яўлення славян і іх прарадзіме. Пачатак шырокага рассялення славян. Культура пражскага тыпу. Раздзяленне славян. Культура Корчак. Культуры лука-райкавецкая, раменская і боршаўская. Тушэмлінская культура. Доўгія курганы і сопкі.

Адзіныя рысы славянскай культуры да X стагоддзя. Курганы. Скроневыя кольцы. Грыўны. Кераміка. Земляробчыя прылады. Славянскі плуг. Зброя. Узнікненне замкаў. Рэлігійны цэнтр у Арконе. Манетная справа ў заходніх і паўднёвых славян.

Старажытная Русь

Узнікненне Русі паводле археалагічных даных. Складанне феадальнай дзяржаўнасці. Нарманскае пытанне паводле археалагічных даных. Гнёздаўскі і іншыя дружынныя могільнікі. Зброя. Магчымасць этнічных вызначэнняў паводле археалагічных даных.

Старажытнаруская вёска. Сельскія паселішчы. Гаспадарка. Прылады вытворчасці. Структура сельскагаспадарчых культур. Сістэмы земляробства. Жывёлагадоўля. Сельскае рамяство. Сялянскія курганы. Замкі феадалаў.

Старажытнарускія гарады. Паходжанне гарадоў. Колькасць і тапаграфія гарадоў. Планіроўка і забудова. Сядзібы. Элементы ўпарадкаванасці. Вуліцы. Дрэнажная сістэма. Гарадскія ўмацаванні. Манументальная архітэктура. Гарадское рамяство. Унутраны і знешні гандаль. Грашовае абарачэнне. Пісьменнасць паводле археалагічных даных.

Партрэты гарадоў. Кіеў. Ноўгарад. Археалагічныя сведкі татара-мангольскага нашэсця.

Модуль 2. Археалогія Беларусі

Уводзіны

Месца беларускага рэгіёна ў старажытнай гісторыі народаў Усходняй Еўропы. Значэнне археалагічных крыніц для вывучэння гістарычнага мінулага насельніцтва, якое жыло на тэрыторыі Беларусі. Колькасць улічаных археалагічных помнікаў у Рэспубліцы Беларусь і іх структура. Заканадаўства Беларусі аб ахове і выкарыстанні помнікаў гісторыі і культуры. Асноўныя патрабаванні да правядзення археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Беларусі.

Станаўленне і развіццё археалагічнай навукі ў Беларусі. Развіццё гістарычнага краязнаўства ў Беларусі ў XVI—XIX ст. Апісанні і спробы сістэматызацыі археалагічных помнікаў у XIX — пачатку XX ст. Раскопкі асобных помнікаў Е.П. і К.П. Тышкевічамі, З. Глогерам, В.З. Завітневічам,

В.А. Шукевічам, Е.Р. Раманавым і інш. Дзейнасць Віленскай археаграфічнай камісіі. Віленскі музей старажытнасцей. Археалагічныя зборы ў музеях Мінска, Магілёва, Віцебска, Гродна. Археалагічныя калекцыі ў прыватных зборах. Агульная ацэнка дарэвалюцыйнай археалогіі ў Беларусі.

Развіццё археалагічнай навукі ў БССР. Стварэнне Інбелкульту і першых спецыяльных археалагічных даследчых цэнтраў. Асноўныя напрамкі археалагічных даследаванняў ў БССР у 1920—1930-я гг. А.М. Ляўданскі, К.М. Палікарповіч, С.А. Дубінскі, А.Д. Каваленя, І.А. Сербаў. Роля краязнаўчых арганізацый у выяўленні археалагічных помнікаў на тэрыторыі Беларусі.

Археалагічныя даследаванні ў Заходняй Беларусі ў 1920-1930-я гг. З.Шміт, Ю. Ядкоўскі, З. Дурчэўскі.

Публікацыі археалагічных матэрыялаў у даваенны час.

Пасляваенныя археалагічныя даследаванні ў БССР. Вывучэнне помнікаў каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў.

Раскопкі старажытнарускіх паселішчаў і могільнікаў. Вывучэнне праблем этнічнай гісторыі. Кароткі агляд асноўнай археалагічнай літаратуры. Абагульняючыя работы па археалогіі Беларусі. Задачы і перспектывы далейшага вывучэння археалагічных помнікаў Беларусі.

Выданне археалагічных картаў і абласных збораў помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

Каменны век

Палеаліт. Месца палеаліту ў геалагічнай гісторыі Зямлі. Перыядызацыя палеаліту. Пытанне аб першапачатковым засяленні тэрыторыі Беларусі. Эпоха вялікага абледзянення. Знаходкі прылад мусцьерскіх форм на Беларусі і іх інтэрпрэтацыя. Засяленне паўднёва-ўсходняй Беларусі ў познепалеалітычны час. Стаянка Бердыж. Умовы залягання і змест культурнага пласта. Асноўныя групы прылад. Пытанне аб бердыжскіх гаспадарча-побытавых аб’ектах. Фауністычны комплекс. Храналогія бердыжскай стаянкі.

Стаянка Юравічы. Крамянёвы інвентар. Храналогія. Сляды мастацтва. Месца беларускіх помнікаў палеаліту сярод познепалеалітычных культур Еўропы. Духоўная культура, вераванні, грамадская структура.

Максімум пахаладання 18—20 тыс. гг. назад і яго вынікі. Фінальны палеаліт (10—12 тыс. гг. назад). Пацяпленне клімату. Фінальнапалеалітычныя культуры Беларусі і суседніх тэрыторый. Культуры Лінгбі і ранні Свідэр. Засяленне вісла-дняпроўскага міжрэчча і верхняга Падняпроўя. Грэнская культура. Тыпы крамянёвых вырабаў. Апрацоўка косці.

Мезаліт. Вызначальныя рысы эпохі. Храналогія. Змены клімату, раслінага і жывёльнага свету. Колькасць мезалітычных месцазнаходжанняў на тэрыторыі Беларусі. Тапаграфія і стратыграфія мезалітычных стаянак. Тэхніка апрацоўкі каменя і формы каменных прылад. Распаўсюджванне лука і стрэлаў. Помнікі позняга Свідэра. Дняпроўска-дзісненская (сожская),

кундская, яніславіцкая культуры. Мікралітызацыя культур. Нёманская і кудлаеўская культуры. Касцяныя вырабы. Гаспадарка. Развіццё рыбалоўства. Росквіт збіральніцтва. Грамадская структура. Духоўная культура і мастацтва.

Асноўныя напрамкі рассялення людзей у мезаліце на тэрыторыі Беларусі і праблемы этнасу.

Неаліт. Вызначальныя рысы неалітычнай эпохі. Храналагічныя межы. Перыядызацыя беларускага неаліту. Удасканальванне тэхнікі апрацоўкі каменя. Патрэба ў новых відах каменных прылад. Здабыча і апрацоўка крэменю. Характарыстыка крамянёвага інвентару. Краснасельскія шахты і крэмнеапрацоўчыя майстэрні. Распаўсюджванне краснасельскага крэменю. З'яўленне керамікі.

Стаянкі: тапаграфія і тыпы, стратыграфія. Жытлы. Росквіт прысвойваючай гаспадаркі. Лясное паляванне. Павышэнне ролі рыбалоўства. Пытанне аб з'яўленні вытворчай гаспадаркі на тэрыторыі Беларусі. Апрацоўка дрэва і косці. Ткацтва. Сацыяльныя працэсы ў неаліце. Росквіт радавой абшчыны. Рэлігійныя вераванні. Мастацтва.

Фарміраванне неалітычных культур і іх сувязь з культурамі мезаліту. Днепра-данецкая культура. Кераміка, каменны інвентар. Культурныя асаблівасці Заходняга Палесся. Верхнедняпроўская культура. Нёманская культура, тры этапы ў яе развіцці. Нарвенская культура Паўночнай Беларусі і Прыбалтыкі. Кераміка і каменны інвентар. Касцяныя вырабы. Тарфянікавыя стаянкі. Міграцыя плямён культуры шарападобных амфар з Цэнтральнай Еўропы. Распаўсюджванне ў Паўночнай Беларусі помнікаў тыповай грабеньчата-ямачнай керамікай. Месца беларускага неаліту сярод неалітычных культур Еўропы.

Даныя археалогіі, лінгвістыкі і антрапалогіі аб этнічнай прыналежнасці неалітычных плямён на Беларусі.

Бронзавы век

Асноўная сутнасць і храналагічныя межы бронзавага веку Беларусі. Медна-бронзавая металургія. Металічныя вырабы. Крыніцы паступлення металу. Росквіт крэмнеапрацоўчай індустрыі. Экспансія жывёлагадоўчых плямён і ўсталяванне вытвараючых гаспадарак — земляробства і жывёлагадоўлі. Змены ў сацыяльнай арганізацыі. Пытанне аб індаеўрапейцах.

Сярэднядняпроўская культура. Арэал. Паселішчы. Жытлы. Тыпы пахаванняў. Формы керамікі. Вырабы з металу і іншых матэрыялаў. Баявыя сякеры. Гаспадарка. Пытанне аб этнічнай прыналежнасці сярэднядняпроўскіх плямён.

Жуцаўская культура. Палеская культура шнуравой керамікі. Паўночнабеларуская культура. Тарфяныя паселішчы. Асаблівасці іх вывучэння. Сярэдні і позні этапы бронзавага веку Беларусі. Сосніцкая культура. Помнікі Палесся. Пранікненне лужыцкіх плямён. Пытанне аб іх этнасе.

Позні бронзавы век Паўночнай Беларусі. Культура ранняй штрыхаванай керамікі. Ранні этап днепра-дзінскай культуры.

Абмен у бронзавым веку. Мастацтва. Арнаментальныя матывы ў кераміцы. Распаўсюджванне новых вераванняў. Вогнепаклонніцтва. Лёс мясцовага позненеалітычнага насельніцтва ў II тыс. да н.э.

Жалезны век

Агульная характарыстыка жалезнага веку Беларусі. Храналагічныя рамкі. Пачатак вытворчасці жалеза. Тэхналагічны працэс. Уладкаванне домніц. Атрыманне сырцовай сталі. Далейшае развіццё вытвараючай эканомікі. Крывоградзільнае рала з Капланавіч. Прадукцыйнасць крывоградзільных ралаў. Ускладненне жывёлагадоўчай гаспадаркі. Сацыяльныя змены ў жалезным веку. Распаўсюджванне гарадзішчаў. Характар этнічных працэсаў. Археалагічныя культуры і этнічныя супольнасці ў жалезным веку. Выкарыстанне даных лінгвістыкі і антрапалогіі ў этнічнай інтэрпрэтацыі археалагічных культур жалезнага веку.

Ранні жалезны век Паўднёвай Беларусі. Позднелужыцкія знаходкі на Беларусі. Пытанне аб этнічнай прыналежнасці лужычан. Экспансія ва ўсходне-лужыцкія вобласці паморскіх плямён. Культура падклошавых пахаванняў. Помнікі гэтай культуры на тэрыторыі Беларусі. Погляды на этнічную прыналежнасць плямён падклошавай культуры. Рух падклошавых плямён на ўсход. Мілаградская культура. Храналагічныя рамкі. Гісторыя вывучэння. Паселішчы, жытлы, могільнікі. Керамічны матэрыял. Грузікі. Гаспадарчыя і бытавыя вырабы з металу. Прывазныя вырабы. Гарошкаўскі скарб. Грамадскія адносіны і вераванні. Паходжанне і этнічная атрыбуцыя культуры. Зарубінецкая культура. Арэал. Гісторыя вывучэння. Храналагічныя рамкі. Тыпы паселішчаў. Жытлы. Могільнікі. Лакальныя групы. Кераміка. Прылады працы, зброя, прадметы ўбору і ўпрыгажэнні. Зарубінецкія фібулы. Гаспадарка. Чаплінскае гарадзішча. Культурныя і гандлёвыя сувязі зарубінецкіх плямёнаў. Грамадскі лад. Рэлігійныя ўяўленні. Пытанне аб паходжанні і этнічнай прыналежнасці зарубінецкіх плямён. Помнікі тыпу Брэст-Трышын. Погляды на этнічную прыналежнасць помнікаў.

Кіеўская культура. Арэал. Гісторыя вывучэння. Храналагічныя рамкі. Паселішчы. Абідня. Тайманава. Жытлы. Пахавальны абрад. Керамічны матэрыял. Вырабы з выемчатай эмаллю. Культурныя аналагі. Сувязь помнікаў з папярэднімі культурамі. Паходжанне культуры. Этнічная прыналежнасць.

Жалезны век Сярэдняй і Паўночна-Заходняй Беларусі. Культура позняй штрыхаванай керамікі. Гісторыя вывучэння. Арэал. Храналагічныя рамкі. Паселішчы. Абарончыя збудаванні. Забудова гарадзішчаў. Гарадзішча Малышкі. Жытлы. Ачагі. Пытанне аб пахаваннях. Металаапрацоўка. Керамічны матэрыял. Гаспадарка і грамадскі лад. Вераванні. Паходжанне культуры. Кампаненты, што ўдзельнічалі ў складанні культуры.

Узаемадзеянні з суседнімі культурамі. Этнічная характарыстыка плямён Сярэдняй Беларусі.

Жалезны век Паўночнай Беларусі. Позні этап днепра-дзвінскай культуры. Арэал. Датаванне. Гісторыя вывучэння. Тапаграфія паселішчаў. Абарончыя збудаванні. Жытлы. Лакальныя асаблівасці. Матэрыяльная культура. Гаспадарка. Грамадскі строй. Паходжанне культуры. Лінгва-антрапалагічная сітуацыя ў рэгіёне. Этнічная атрыбуцыя культуры.

Славяне і іх суседзі ў другой палове I тыс. н.э.

Славянскія помнікі другой паловы I тыс. н.э. Пытанне аб найстаражытных праславянскіх культурах. Пражская культура і яе асноўныя характарыстыкі. Паселішчы, жытлы, пахаванні. Матэрыяльная культура. Змены ў гаспадарцы і грамадскім ладзе. Лука-Райкавацкая культура. Гарадзішча і селішча Хотамель. Час рассялення славян па тэрыторыі на поўнач ад Прыпяці. Лінгвістычныя даныя аб часе засялення славянамі Сярэдняй і Паўночнай Беларусі. Распаўсюджванне сферычных курганаў з трупаспаленнем. З'яўленне ганчарнай керамікі. Маналітнасць і аднастайнасць славянскай культуры таго перыяду. Генетычная сувязь з папярэдняй культурай Паўднёвай Беларусі і Валыні. Узаемадзеянне славян з балтамі. Змены ў культуры доўгіх курганаў. Лінгвістычныя і антрапалагічныя даныя аб сімбіёзе балтаў і славян. Уплыў балцкага субстрату на далейшае развіццё культуры славян гэтага рэгіёна. Пытанне аб "летапісных плямёнах" і іх старажытнасцях.

Старажытнасці балтаў другой паловы I тыс. н.э. Інтэграцыя культурных элементаў. Распаўсюджванне селішчаў і гарадзішчаў-сховішчаў. Трупаспаленні ў курганах і грунце. Новыя формы керамікі. Банцараўская культура. Арэал. Гісторыя вывучэння. Храналогія. Паселішчы і жытлы. Пахавальныя помнікі. Матэрыяльная культура. Гаспадарка і грамадскі лад. Паходжанне культуры. Калочынская культура. Арэал. Гісторыя вывучэння. Храналагічныя рамкі. Паселішчы і жылыя пабудовы. Матэрыяльная культура і гаспадарка. Паходжанне культуры. Этнічная прыналежнасць носьбітаў культуры. З'яўленне доўгіх курганаў. Формы магільных збудаванняў і пахавальны абрад. Гісторыя вывучэння доўгіх курганаў. Пахавальны інвентар. Яго сувязь с папярэдняй культурай мясцовых плямён. Погляды на паходжанне і этнічную прыналежнасць культуры доўгіх курганаў.

Помнікі яцвягаў. Усходнелітоўскія курганы на тэрыторыі Беларусі.

Археалогія сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі

Эпоха ранняга сярэднявечча на тэрыторыі Беларусі. Новыя рысы эпохі. Утварэнне старажытнарускай дзяржавы і месца ў ёй заходніх зямель. Прычыны пераходу ўсходніх славян да феадалізму, мінуючы рабаўладальніцкую фармацыю. Ускладненне і разнастайнасць археалагічных помнікаў ранняга феадалізму. З'яўленне новых відаў помнікаў. Археалагічныя даныя аб узнікненні феадалізму. Адлюстраванне сацыяльных працэсаў у археалагічным матэрыяле. Асаблівасці фарміравання

старажытнарускай народнасці на тэрыторыі Беларусі. Завяршэнне асіміляцыі рэштак стажытнага балцкага насельніцтва.

Археалогія вёскі. Значэнне археалагічнага вывучэння старажытнарускай вёскі. Ступень вывучанасці сельскіх помнікаў. Тапаграфія сельскіх паселішчаў, іх памеры. Тып забудовы. Асноўныя віды жылых і гаспадарчых пабудоў. Будаўнічая тэхніка. Селішча каля в. Гарадзішча пад Мінскам. Гаспадарка старажытнарускай вёскі. Асноўныя прылады землеапрацоўкі. Сохі. Плугі. Чарэслы. Матыкі. Лапаты. Структура зерневых культур. Вядучае значэнне жыта. Іншыя культуры. Археалагічныя і палеабатанічныя даныя аб сістэмах земляробства. Другасная роля падсекі. Прылады ўборкі і пераапрацоўкі ўраджаю. Их новыя формы і вытворчыя магчымасці. Жорны. Ступы. Дамашняя жывёлагадоўля. Склад статку дамашніх жывёл па астэалагічных даных. Значэнне прысвойваючых форм у вясковай гаспадарцы. Асаблівасці вясковага рамяства. Кавальская справа. Вясковае ювелірнае рамяство. Радыус збыту прадукцыі ювеліраў. Ганчарная справа. Іншыя віды рамяства. Вясковыя курганы. Абрады пахаванняў і пахавальны інвентар. Пытанне аб скроневых кольцах і зярністых пацерках як этнічна вызначальных прыкметах. Перажыткі паганства паводле археалагічных даных.

Феадальныя замкі. Значэнне археалагічнага вывучэння старажытнарускіх замкаў. Ступень вывучанасці. Археалагічныя прыкметы замка — умацаванай уладарніцкай сядзібы. Тапаграфія замкаў. Іх тыпалогія. Памеры. Уладкаванне замкавых умацаванняў. Асаблівасці ўнутранай планіроўкі і забудовы. Матэрыяльная культура замкаў. Гаспадарчае жыццё. Пытанне аб замкавым рамястве. Зброя. Прывазныя вырабы. Склад насельніцтва. Аб часе з’яўлення і шырокага распаўсюджвання замкаў.

Даследаванне Вішчынскага замка. Скарб ювелірных вырабаў і плацежных срэбраных зліткаў. Ювелірныя матрыцы. Пломбы-пячаткі.

Гарады заходніх зямель Русі. Сацыяльна-эканамічная характарыстыка горада. Прычыны ўзнікнення гарадоў. Колькасць гарадоў у заходніх землях Русі. Гісторыя археалагічнага вывучэння гарадоў у Рэспубліцы Беларусь. Пытанне аб часе ўзнікнення заходнерускіх гарадоў. Розныя шляхі ўзнікнення гарадоў. Тапаграфія гарадоў. Дзядзінец, пасад, акольны горад. Гарадскія ўмацаванні. Абарончыя збудаванні Мінска. Уладкаванне ўезду ў мінскую крэпасць. Каменная фартыфікацыя Гродна. Унутраная планіроўка і забудова гарадоў. Радыяльна-кальцавы і веерападобны планы. Вуліцы, плошчы, гарадскі торг. Элементы гарадскога добраўпарадкавання. Уладкаванне маставых. Дрэнажныя сістэмы. Жылыя і гаспадарчыя пабудовы. Іх рэканструкцыя. Будаўнічая тэхніка. Унутраная планіроўка. Печы. Пабудовы знаці. Мураваныя пабудовы ў Навагрудку. Гарадскія сядзібы. Устойлівасць планіроўкі. Мураваныя грамадзянскія пабудовы. Манументальная культавая архітэктура. Архітэктурныя школы ў заходніх землях Русі.

Гарадское рамяство. Апрацоўка жалеза. Вырабы са сталі. Ювелірная справа. Інструмент. Тэхніка. Пытанне аб мясцовым эмальерным мастацтве. Шкларобства. Ганчарнае рамяство. Клеймы. Апрацоўка дрэва, косці, каменя.

Гарбарная і шавецкае рамёствы. Прадзенне і ткацтва. Арганізацыя рамяства. Унутраны і знешні гандаль. Прадметы ўвозу і вывазу. Грашовае абарачэнне. Сродкі транспарту. Культурнае жыццё горада. Надпісы на бытавых рэчах. Берасцяныя граматы. Пісалы. Барысавы і Рагвалодаў камяні. Шахматы. Манументальны жывапіс. Прыкладное мастацтва. Партрэты асобных гарадоў: Мінск, Полацк.

Археалогія позняга сярэднявечча (XIV—XVIII ст.). Характарыстыка эпохі. Значэнне вывучэння яе помнікаў. Замкі і абарончыя збудаванні. Лідскі, Крэўскі і Мірскі замкі. Навагрудак. Гродна. Камянецкая і іншыя абарончыя вежы-данжоны. Горадабудаўніцтва. Будынкі XV—XVII ст. з цэглы і каменя ў Гродне. Культавая архітэктура. Будаўнічыя і дэкаратыўныя матэрыялы. Кераміка.

Мястэчкі. Сельскія паселішчы. Гаспадарка. Матэрыяльная і духоўная культура беларускага народа ў XIV—XVIII ст.

Літаратура

Асноўная

1. Авдусин Д.А. Основы археологии. М., 1989.
2. Арциховский А.В. Введение в археологию. М., 1947.
3. Загорульский Э.М. Археология Белоруссии. Мн., 1965.
4. Мартынов А.И. Археология. М., 2005.
5. Фэйган Б. М. Уводзіны ў археалогію. Мн., 1996.

Дадатковая

1. Алексеев Л.В. Полоцкая земля (очерки истории Северной Белоруссии в IX—XIII вв.). М., 1966.
2. Алексеев Л.В. Археология и краеведение Белоруссии XVI — 30-е гг. XX в. Мн., 1996.
3. Алексеев Л.В. Западные земли домонгольской Руси: Очерки истории, археологии, культуры: в 2 кн. М.: Наука, 2006.
4. Амальрик А.С., Монгайт А.Л. В поисках исчезнувших цивилизаций. М., 1959.
5. Артеменко И.И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. М., 1966.
6. Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1993.
7. Археалогия Беларуси у 4 т. Мн., 1997—2001.
8. Белорусская археология. Достижения археологов за годы советской власти. Мн., 1987.
9. Вяргей В.С. Археалагічная навука ў Беларускай ССР. 1919—1941 гг. Мн., 1992.
10. Гуревич Ф.Д. Древний Новогрудок (посад — окольный город). Л., 1981.
11. Гурин М.Ф. Кузнечное ремесло Полоцкой земли IX—XIII вв. Мн., 1987.
12. Гурин М.Ф. Древнее железо Белорусского Поднепровья (I тыс. н. э.). Мн., 1982.
13. Гурина Н.Н. Древние кремнеобрабатывающие шахты на территории СССР. Л., 1976.
14. Дучыц Л.У. Браслаўскае Паазер’е ў IX—XIV стст. Мн., 1991.
15. Егорейченко А.А. Древние городища Белорусского Полесья. Мн., 1996.
16. Егорейченко А.А. Культуры штрихованной керамики. Мн., 2006.
17. Загарульскі, Э.М. Заходняя Русь IX – XIII стст.: Вучэбны дапаможнік / Э.М.Загарульскі. – Мн., 1998.
18. Загорульский Э.М. Возникновение Минска. Мн., 1982.
19. Загорульский Э.М. Древняя история Белоруссии. Мн., 1977.
20. Загорульский Э.М. Начало формирования населения Белоруссии (дославянский период). – Мн., 1996.
21. Заяц Ю.А. Заславль в эпоху феодализма. Мн., 1995
22. Зверуго Я.Г. Верхнее Понеманье в IX—XIII вв. Мн., 1989.
23. Зверуго Я.Г. Древний Волковыск. Мн., 1975.
24. Звяруга Я.Г. Беларускае Павілле у жалезным веку і раннім сярэднявякоўі/ Матэрыялы па археалогіі Беларусі, вып. 10. – Мінск: ДНУ”Інстытут гісторыі НАН Беларусі”, 2005.

25. Исаенко В.Ф. Неолит Припятского Полесья. Мн., 1976.
26. Калечиц Е.Г. Первоначальное заселение территории Белоруссии. Мн., 1984.
27. Каханоўскі Г.А. Археалогія і гістарычнае краязнаўства ў XIV—XIX ст. Мн., 1984.
28. Керам К. Боги, гробницы, ученые. М., 1960.
29. Коробушкина Т.Н. Земледелие на территории Белоруссии в X—XIII вв. Мн., 1979.
30. Коробушкина Т.Н. Курганы Белорусского Побужья X—XIII вв. Мн., 1993.
31. Краўцэвіч А.К. Гарады і замкі Беларускага Панёмання XIV—XVIII ст. Мн., 1991.
32. Ксензов В.П. Палеолит и мезолит Белорусского Поднепровья. Мн., 1988.
33. Кухаренко Ю.В. Зарубинецкая культура. М., 1964.
34. Кухаренко Ю.В. Средневековые памятники Полесья. М., 1961.
35. Левко О.Н. Витебск IX—XVIII вв. Мн., 1984.
36. Лысенко П.Ф. Берестье. Мн., 1985.
37. Лысенко П.Ф. Города Туровской земли. Мн., 1974.
38. Лысенко П.Ф. Дреговичи. Мн., 1991.
39. Медведев А.М. Белорусское Понеманье в раннем железном веке. Мн., 1996.
40. Мельниковская О.М. Племена Южной Белоруссии в раннем железном веке. М., 1967.
41. Митрофанов А.Г. Железный век Средней Белоруссии (VII—VI вв. до н.э. — VIII в. н.э.). Мн., 1978.
42. Монгайт А.Л. Археология Западной Европы. Каменный век. М., 1973.
43. Монгайт А.Л. Археология Западной Европы. Бронзовый и железный века. М., 1974.
44. Очерки по археологии Белоруссии: В 2 ч. Мн., 1970; 1972.
45. Поболь Л.Д. Славянские древности Белоруссии. Мн., 1971.
46. Поболь Л.Д. Археологические памятники Белоруссии. Железный век. Мн., 1983.
47. Поликарпович К.М. Палеолит Верхнего Поднепровья. Мн., 1968.
48. Русанова И.П. Славянские древности VI—VII вв. М., 1976.
49. Седов В.В. Восточные славяне в VI—XIII вв. М., 1982.
50. Седов В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. М., 1970.
51. Седов В.В. Славяне в древности. М., 1994.
52. Седов В.В. Славяне в раннем средневековье. М., 1995.
53. Седов В.В. Славяне. М., 2002.
54. Ткачев М.А. Замки Белоруссии. Мн., 1980.
55. Ткачоў М.А. Абарончыя збудаванні заходніх зямель Беларусі XIII--XVIII ст. Мн., 1978.
56. Третьяков П.Н. У истоков древнерусской народности. Л., 1970.
57. Третьяков П.Н. Финно-угры, балты и славяне на Днепре и Волге. М., 1966.
58. Трусов О.А. Памятники монументального зодчества Белоруссии XI—XVII вв. Мн., 1988.

59. Чарняўскі М.М. Неаліт Беларускага Панямоння. Мн., 1979.
60. Шадыра В.І. Беларускае Падзвінне (І тыс. н.э.). Мінск: ДНУ”Інстытут гісторыі НАН Беларусі”, 2006.
61. Шадыро В.И. Ранний железный век Северной Белоруссии. Мн., 1985.
62. Штыхаў Г.В. Крывічы. Мн., 1992.
63. Штыхов Г.В. Города Полоцкой земли. Мн., 1978.
64. Штыхов Г.В. Древний Полоцк IX—XIII вв. Мн., 1975.